**УДК 94(476):331.108**

# РЭЗАНАНСНЫЯ СПРАВЫ Ў САВЕЦКАЙ БЕЛАРУСІ ЯК ВЫНІК ПАСПЯХОВАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ПРАВААХОЎНЫХ СТРУКТУР (1970–1980-Я ГГ.)

# HIGH-PROFILE CASES IN SOVIET BELARUS AS A RESULT OF THE SUCCESSFUL WORK OF LAW ENFORCEMENT AGENCIES (1970S–1980S)

**І. А. Пушкін**
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт харчовых і хімічных тэхналогій,
дацэнт кафедры сацыяльна-гуманітарных дысцыплін і фізічнай культуры,
кандыдат гістарычных навук, дацэнт

***Анатацыя.*** *У артыкуле асветлены вынікі паспяховай дзейнасці праваахоўных структур у расследаванні неправамерных дзеянняў кіраўнікоў некаторых прадпрыемстваў Савецкай Беларусі, якія мелі шырокі грамадскі рэзананс у 1970–1980-я гг.*

***Ключавыя словы:*** *Савецкая Беларусь, БССР, праваахоўныя структуры, злачыннасць, неправамерная дзейнасць.*

***Annotation.*** *The article highlights the results of successful activities of law enforcement agencies in investigating illegal actions of the heads of enterprises of Soviet Belarus that had a wide public resonance in the 1970–1980s.*

***Keywords:*** *Soviet Belarus, BSSR, law enforcement agencies, crime, illegal activities.*

Вытокі прававой культуры сучаснага беларускага грамадства непарыўна звязаны з перыядам існавання СССР і БССР. У апошнія два дзесяцігоддзі савецкай мадэрнізацыі (1970–1980-я гг.) былі выяўлены факты арганізаванай і карумпаванай злачыннасці, якія атрымалі шырокі грамадскі рэзананс. Варта ўзгадаць найбольш гучныя справы: шматлікія факты хабарніцтва сярод работнікаў кіравання Краснадарскага краю (1982 г.), у гандлёвай арганізацыі «Гастраном» Галоўнага ўпраўлення гандлю Маскоўскага гарвыканкама (1983 г.), у Дзяржаўным камітэце СССР па эканамічных сувязях і Міністэрстве знешняга гандлю СССР пры заключэнні здзелак з замежнымі фірмамі (1986 г.); злоўжыванні і парушэнні законнасці ў органах унутраных спраў Іркуцкай вобласці (1986 г.) і інш. [1, арк. 1; 2, арк. 1; 3, арк. 1; 4, арк. 1–4].

У Савецкай Беларусі ў 1970-я гг. можна ўзгадаць так званыя мінскую і аршанскую справы, у якія былі ўцягнуты як гаспадарнікі, так і партыйныя, савецкія работнікі, а таксама некаторыя супрацоўнікі праваахоўнай сістэмы [5, с. 71; 6, с. 225]. Шырокавядомымі сталі факты злоўжыванняў уладаю і неправамерных дзеянняў кіруючымі работнікамі шэрагу прадпрыемстваў Гродзенскай вобласці [7, арк. 44, 55; 8, арк. 280]; нафтаздабываючага ўпраўлення «Рэчыцанафта» аб’яднання «Беларуснафта», у якім, на думку пракуратуры

БССР, прыпіскі да дзяржаўнага плана здабычы нафты былі арганізаваны начальнікам аб'яднання «Беларуснафта», а выканаўцамі сталі начальнік і галоўны інжынер «Рэчыцанафта» [9, арк. 18–20]. У Магілёўскай вобласці крадзяжамі дзяржаўных сродкаў з выкарыстаннем службовага становішча займаліся ў вытворчым аб'яднанні «Бабруйсксельмаш», дзе ініцыятарамі былі намеснік генеральнага дырэктара аб'яднання, начальнікі планавага і вытворчага аддзелаў, выконваючы абавязкі галоўнага бухгалтара [10, арк. 44]. Доўгі час у будаўнічым упраўленні № 58 трэста «Лаўсанбуд» (Магілёў) дзейнічала група раскрадальнікаў, якая займалася крадзяжом будаўнічых матэрыялаў. Адным з актыўных яе ўдзельнікаў з'яўляўся начальнік гэтага ўпраўлення [11, арк. 183, 200].

Безумоўна, парушальнікаў закона прыцягнулі да адказнасці. Але ў праваахоўных органаў савецкага часу былі пэўныя складанасці пры правядзенні следчых мерапрыемстваў, асабліва ў дачыненні да прадстаўнікоў партыйна-савецкай і гаспадарчай наменклатуры. Каб вонкава захоўваць перавагі сацыялістычнага ладу, партыйна-савецкае кіраўніцтва стварала перашкоды ў дзейнасці праваахоўных структур пры расследаванні неправамерных дзеянняў пэўных гаспадарчых кіраўнікоў, замоўчвала факты парушэнняў і абмяжоўвалася часцей партыйнымі спагнаннямі [6, с. 224–234; 12, с. 519–524; 13, с. 328–345]. Толькі прынцыповасць і прафесіяналізм работнікаў праваахоўных структур дазвалялі рэалізоўваць прынцыпы «справядлівасці і роўнасці перад законам» у грамадстве. У якасці прыкладаў разгледзім некалькі рэзанансных спраў на Магілёўшчыне, характэрных для 1970–1980-х гг.

На пасяджэнні бюро Магілёўскага абласнога камітэта КПБ 9 сакавіка 1972 г. разглядалася пытанне «Аб выніках праверкі камітэтам партыйнага кантролю пры ЦК КПСС лістоў аб фактах крадзяжоў сацыялістычнай уласнасці ў г. Бабруйску» [14, арк. 41–46]. На пасяджэнні бюро прагучала: «На протяжении ряда лет уровень хищений в г. Бобруйске стабилен, наблюдается тенденция к увеличению групповых хищений в крупных размерах…» [14, арк. 44]. Пад уплывам указанняў «зверху» мясцовае партыйнае кіраўніцтва прыняла рашэнне: кіраўнікоў, дзе былі выяўлены крадзяжы, зняць з пасад. Але адзін з іх адразу быў прызначаны дырэктарам таксаматорнага парка, другі — намеснікам дырэктара тэатра драмы і камедыі ў Бабруйску і г. д., прычым па іх віне былі дапушчаны крадзяжы. Цалкам верагодна, што менавіта таму з году ў год пастаянна расла колькасць злачынстваў у Бабруйску. Асабліва ўскладнілася сітуацыя ў 1979 г. Мясцовыя ўлады нават звярнуліся ў вышэйстаячыя органы з просьбамі аб стварэнні ў Бабруйску замест аднаго двух аддзяленняў міліцыі, структурна падначаленых гарадскому аддзелу ўнутраных спраў, і аб павелічэнні штатнай колькасці міліцыі [15, арк. 9].

У крадзяжах дзяржаўнай маёмасці актыўна ўдзельнічалі работнікі адміністрацыйна-кіраўнічага апарату вытворчага аб'яднання «Бабруйскшына». У 1981–1983 гг. за здзяйсненне крадзяжу прадукцыі і іншых матэрыяльных каштоўнасцей на аб'яднанні да крымінальнай адказнасці прыцягнулі 15 кіруючых работнікаў і службовых асоб аб'яднання [16, арк. 4]. Генеральнаму дырэктару (працаваў на пасадзе са жніўня 1978 па люты 1982 г., член КПСС з 1971 г.) бюро Бабруйскага гаркама КПБ абвясціла строгую вымову «за непринятие надлежащих мер по обеспечению сохранности социалистической собственности, злоупотребление служебным положением в корыстных целях» і прапанавала вызваліць яго з пасады [17, арк. 74]. Пасля звальнення яго прызначылі намеснікам дырэктара па капітальнаму будаўніцтву Бабруйскага гарбарнага камбіната. З падобным не пагадзіліся праваахоўнікі, у прыватнасці пракуратура.

Пракуратура БССР абвінавачвала былога генеральнага дырэктара ў прысваенні камплектаў футбольнай формы, падараваных фірмай «Круп» (ФРГ) футбольнай камандзе «Шыннік», крадзяжы сумесна з іншымі асобамі спірту, прысваенні паліраваных шчытоў, абліцовачнай пліткі, атрыманне ад падначаленых асоб (незаконна прэміраваных) грашовых сродкаў і інш. Вінаватасць у здзяйсненні названых злачынстваў пацвярджалася актамі дакументальных рэвізій, бухгалтарскімі і іншымі дакументамі, рэчавымі доказамі, паказаннямі сведак [6, с. 232; 18, арк. 80]. Быў выяўлены склад злачынства, прадугледжаны п. 4.3 арт. 91 Крымінальнага кодэкса БССР, — крадзёж дзяржаўнай і грамадскай маёмасці ў буйных памерах.

Каб пазбегнуць адказнасці, былы генеральны дырэктар паспрабаваў выкарыстаць свае сваяцкія і сяброўскія сувязі. Праз свайго брата — лаўрэата дзяржаўнай прэміі з Масквы — звярнуўся з лістом у Магілёўскі абкам КПБ, каб партыйныя ўлады ўмяшаліся ў расследаванне пракуратуры. Даслаў лісты ў ЦК КПСС К. Чарненку, А. Аксёнаву, Ц. Кісялёву. Свае дзеянні тлумачыў прамерным даверам да падначаленых, на якіх ніякага націску не аказваў, паказваў свае ранейшыя працоўныя заслугі і дасягненні, прасіў быць аб'ектыўнымі і не ганьбіць яго імя [19, арк. 85–91]. Але гэта не дапамагло, 16 красавіка 1982 г. Бабруйскі гарвыканкам, разгледзеўшы на сваім пасяджэнні прадстаўленне пракуратуры БССР, даў згоду (дэпутат гарадскога савета) на прыцягненне яго да крымінальнай адказнасці [20, арк. 77].

Па выніках аператыўна-вышуковай дзейнасці праваахоўных структур стала рэзананснай у 1989 г. справа аб грубых парушэннях дзяржаўнай і фінансавай дысцыпліны ў аграгандлёвай фірме «Дняпро» (Магілёў) пры ажыццяўленні гандлёва-абменных аперацый, растранжыраванні плодаагародніннай прадукцыі і яе стратах, залішняй выплаце кіруючым работнікам,

служачым і спецыялістам грашовага ўзнагароджвання [21, арк. 68]. Магілёўскі абласны выканаўчы камітэт паведаміў, што 7 ліпеня 1989 г. на сесіі абласнога Савета дэпутатаў было прынята рашэнне за невыкананне планаў паставак гародніны і парушэнні фінансавай дысцыпліны генеральным дырэктарам аграгандлёвай фірмы «Дняпро» вызваліць яго з пасады ва ўстаноўленым парадку (генеральны дырэктар быў дэпутатам сельскага і раённага саветаў). Магілёўскі райвыканкам 16 жніўня 1989 г. даў згоду на вызваленне дэпутата раённага савета ад абавязкаў генеральнага дырэктара. На сходзе прадстаўнікоў працоўнага калектыву аграгандлёвай фірмы «Дняпро» 18 жніўня 1989 г. было вырашана правесці выбары генеральнага дырэктара на альтэрнатыўнай аснове. У выніку 20 верасня 1989 г. адбылася канферэнцыя працоўнага калектыву і генеральным дырэктарам выбралі звольненага [22, арк. 60]. Падобны факт сведчыць аб няздольнасці партыйна-савецкага кіраўніцтва ў апошнія гады існавання СССР забяспечваць прынцыпы законнасці і сацыялістычнай справядлівасці.

У сувязі з пагаршэннем сітуацыі ў другой палове 1980-х гг. (хуткі рост злачыннасці, у тым ліку арганізаванай, распаўсюджванне п’янства, наркаманіі, дармаедства, правапарушэнняў сярод непаўналетніх) Вярхоўны Савет СССР 4 жніўня 1989 г. прыняў пастанову «Аб рашучым узмацненні барацьбы са злачыннасцю». Быў створаны Часовы камітэт па барацьбе са злачыннасцю ў СССР [23, арк. 562]. Адпаведна для каардынацыі дзеянняў праваахоўных і дзяржаўных органаў, грамадскіх арганізацый у барацьбе са злачыннасцю Часовыя камітэты па барацьбе са злачыннасцю ствараліся ў абласцях і гарадах БССР [24, арк. 565]. Але, як і раней, асноўны цяжар барацьбы са злачыннасцю ўскладаўся на праваахоўныя структуры.

Такім чынам, падчас савецкай мадэрнізацыі важная роля адводзілася праваахоўным і адміністрацыйным органам, якія, абапіраючыся на грамадскія арганізацыі, павінны былі рэалізоўваць сваю дзейнасць праз прававое выхаванне працаўнікоў, умацаванне сацыялістычнай законнасці і правапарадку, спыненне злачынных праяў, узмацненне папераджальна-прафілактычнай працы ва ўсіх яе формах. Але гэта ў поўным аб’ёме не атрымалася. Становішча са злачыннасцю напрыканцы 1980 – у пачатку 1990-х гг. не паляпшалася. Рэальныя захады па паспяховай барацьбе са злачыннасцю, у тым ліку арганізаванай, і карупцыяй пачаліся ў Беларусі толькі на пачатку станаўлення і развіцця прэзідэнцкай формы кіравання.

---

1. Записка КПК при ЦК КПСС от 16.03.1982 г. // Российский государственный архив новейшей истории (РГАНИ). Ф. 89. Оп. 11. Д. 134. Л. 1. Вярнуцца да артыкула

2. Выписка из протокола № 131/10с от 23.11.1983 г. заседания Секретариата ЦК КПСС // РГАНИ. Ф. 89. Оп. 11. Д. 135. Л. 1. Вярнуцца да артыкула

3. Записка от 02.01.1986 г. министра внутренних дел СССР // РГАНИ. Ф. 89. Оп. 11. Д. 136. Л. 1. Вярнуцца да артыкула

4. Записка председателя КГБ СССР в ЦК КПСС (1986 г.) в связи з массовыми фактами взяточничества // РГАНИ. Ф. 89. Оп. 11. Д. 85. Л. 1–4. Вярнуцца да артыкула

5. Барвінок К. І., Саракавік І. А. Кадравая палітыка ў сістэме МУС Беларусі ў 60–80-х гадах XX ст. // Весці НАНБ. Сер. гуманітар. навук. 2005. № 4. С. 69–75. Вярнуцца да артыкула

6. Пушкін І. А., Агееў А. Р. Кадравы патэнцыял прамысловасці ўсходніх рэгіёнаў БССР (1944–1991) : манагр. Магілёў : БДУТ, 2022. 302 с. Вярнуцца да артыкула

7. Протокол XVI Гродненской областной партийной конференции 18–19.12.1975 г. // Государственный архив общественных объединений Гродненской области. Ф. 1. Оп. 1. Д. 1098. Л. 44, 55. Вярнуцца да артыкула

8. Справка для доклада о фактах нарушения закона при рассмотрении заявлений и жалоб граждан от 12.06.1975 г. // Государственный архив Гродненской области. Ф. 1171. Оп. 5. Д. 160. Л. 280. Вярнуцца да артыкула

9. Письмо Прокуратуры БССР в Гомельский ОК КПБ от 30.08.1974 г. // Государственный архив общественных объединений Гомельской области. Ф. 144. Оп. 142. Д. 36. Л. 18–20. Вярнуцца да артыкула

10. Отчетный доклад Могилевского обкома КПБ XIX областной партийной конференции (23–24.12.1975 г.) // Государственный архив общественных объединений Могилевской области (ГАООМог). Ф. 9. Оп. 155. Д. 1. Л. 44. Вярнуцца да артыкула

11. Протокол заседания пленума Могилевского обкома КПБ от 04.07.1972 г. // ГАООМог. Ф. 9. Оп. 149. Д. 3. Л. 183, 200. Вярнуцца да артыкула

12. Пушкін І. А. Неправамерныя дзеянні пасадавых асоб Савецкай Беларусі ў 1970–1980-я гг. // Правовая культура в современном обществе : сб. науч. ст. / М-во внутр. дел Респ. Беларусь, учреждение образования «Могилевский институт Министерства внутренних дел Республики Беларусь» ; редкол.: И. А. Демидова (отв. ред.) [и др.]. Могилев : Могилев. ин-т МВД, 2022. С. 519–524. Вярнуцца да артыкула

13. Пушкин И. А. Неправомерные действия и злоупотребления служебным положением в советский период модернизации Беларуси, 1970–1991 гг. // Советский опыт: взгляд из XXI века (к 100-летию образования Союза Советских Социалистических Республик) : сб. ст. / редкол.: А. А. Коваленя [и др.]. М. : Фонд «Историческая память», 2023. С. 328–345. Вярнуцца да артыкула

14. Протокол № 28 заседания бюро Могилевского ОК КПБ от 09.03.1972 г. // ГАООМог. Ф. 9. Оп. 149. Д. 12. Л. 41–46. Вярнуцца да артыкула

15. Письмо Могилевского ОК КПБ от 03.01.1980 г. Министру МВД СССР «О создании при Бобруйском городском отделе внутренних дел двух отделений милиции» // ГАООМог. Ф. 9. Оп. 165. Д. 71. Л. 9. Вярнуцца да артыкула

16. Решение КПК при ЦК КПСС от 20.04.1984 «О серьезных недостатках в хозяйственной деятельности ПО “Бобруйскшина”» // ГАООМог. Ф. 9. Оп. 178. Д. 65. Л. 4. Вярнуцца да артыкула

17. Справка от 18.08.1982 г. партийной комиссии при Могилевском обкоме КПБ // ГАООМог. Ф. 9. Оп. 170. Д. 80а. Л. 74. Вярнуцца да артыкула

18. Информация прокурора БССР в исполком Бобруйского городского совета народных депутатов // ГАООМог. Ф. 9. Оп. 170. Д. 80а. Л. 80. Вярнуцца да артыкула

19. Копия письма в прокуратуру БССР // ГАООМог. Ф. 9. Оп. 170. Д. 80а. Л. 85–91. Вярнуцца да артыкула

20. Решение № 36-16 от 16.04.1982 Бобруйского горисполкома // ГАООМог. Ф. 9. Оп. 170. Д. 80а. Л. 77. Вярнуцца да артыкула

21. Постановление КНК БССР от 20.09.1989 г. о фактах нарушения государственной дисциплины в агроторговой фирме «Днепр» // Государственный архив Могилевской области (ГАМог). Ф. 7. Оп. 5. Д. 3862. Л. 68. Вярнуцца да артыкула

22. Информация исполкома Могилевского областного совета от 15.11.1989 г. // ГАМог. Ф. 7. Оп. 5. Д. 3862. Л. 60. Вярнуцца да артыкула

23. Письмо Президиума ВС СССР от 18.08.1989 г. // ГАМог. Ф. 7. Оп. 5. Д. 3861. Л. 562. Вярнуцца да артыкула

24. Письмо Могилевского облисполкома от 31.08.1989 г. в Президиум ВС СССР // ГАМог. Ф. 7. Оп. 5. Д. 3861. Л. 565. Вярнуцца да артыкула